

GP
gpress.info

# ДАЙДЖЭСТ

I квартал
2023 года

I квартал 2023 года не вылучаўся нападкамі праўладных СМІ на ЛГБТК+ супольнасць. Звычайныя «ківанні» ў бок т.зв. «калектыўнага Захада», які, маўляў, жадае разбурыць «традыцыйныя каштоўнасці» беларусаў. Выданне «СБ . Беларусь сёння» наогул лічыць, што «У беларускім соцыюме праблемы ЛГБТ-кам'юніці не існуе як такой».
Зацікаўленасць выклікаў фармат асвятлення ЛГБТК+-павесткі на сайце Нацыянальнага тэлебачання. За 1 квартал 2023 года там выйшлі дзве навіны на дадзеную тэматыку, і абедзьве ў нейтральным стылі. У іх адсутнічае мова варожасці, ацэначныя суджэнні або аўтарскія меркаванні, характэрныя для падобнага кшталту матэрыялаў на сайтах прапагандысцкіх СМІ.
Гаворка ідзе пра навіны «Ва Украіне прапанавалі легалізаваць аднаполыя шлюбы паміж вайскоўцамі» и «ЛГБТ-жаўнеры давялі, што "любяць Украіну"».
Цытата з апошняй навіны наогул ставіць рэкорды свабоды слова ў беларускіх праўладных СМІ: «… традыцыйныя каштоўнасці, якія прасоўвае расійскі прэзідэнт, сталіся стымулам для ўкраінскіх геяў запісвацца ў УСУ і рабіцца патрыётамі. З-за гэтага іншыя ўкраінцы сталі больш пазітыўна глядзець на геяў і трансгендараў».
Як негалосную каманду не кранаць сваіх прыспешнікаў у ЛГБТК+ супольнасці магчыма расцэньваць і выказванні А.Лукашэнкі падчас т.зв. паслання да народа і парламента.




Пасля звычайнай гамафобнай рыторыкі Лукашэнка заявіў:
«Я даручыў, дакладзіце мне, дайце характарыстыку, што гэта за людзі, як яны працуюць... Дай бог не-геям так працаваць, як яны. Аніводнай адмоўнай характарыстыкі не было. Аніводнай, правяраў па розных кірунках.
...Ну давайце мы гэтым мужыкам будзем забараняць кувыркацца з іншымі мужыкамі, ну да чаго гэта прывядзе? Ні да чаго. Тым больш праблемаў нам не ствараюць, працуюць добра».

**Рэдакцыя GayPress**




P.S. Мы скончылі 2022 год з найлепшымі паказчыкамі за ўсю гісторыю сайта Gpress.info. Адной з кропак росту стаўся спецпраект ЛГБТК-миграция. Мы атрымалі дзясяткі тысячаў праглядаў кантэнту гэтага спецпраекту, а таксама жывы водгук аўдыторыі ў выглядзе сотняў каментароў і тысячаў лайкаў.
З улікам нашых акаўнтаў у сацыяльных сетках, падкаст-пляцовак і Telegram-канала, мы кросплатформава збіраем штомесячную аўдыторыю каля 100 000 асобаў.
У сакавіку 2023 года наведваемасць сайта склала амаль 60 000 унікальных наведнікаў.

**Падпісвайцеся на наш Telegram-канал!**



## Трансгендары ў мэтах бяспекі дадалі ў спіс аперацыяў фемінізацыю твару

«Паводле словаў медыкаў, мова ідзе пра серыю працэдураў, якія могуць змяніць форму твару і яго рысы дзеля дасягнення больш жаноцкага знешняга выгляду. Лекары, якія спецыялізуюцца на гэтай працэдуры, адзначаюць, што, акрамя ўсіх формаў гендарна-арыентаванага догляду, які ўключае ў сябе шырокі спектр медыцынскіх паслугаў, аперацыі па трансфармаванні твару могуць пецьпершачарговае значэнне ў працэсе пераходу чалавека».
https://www.autoparus.by/publication/128749



## «Уражаньне, што я па змаўчаньні павінна быць згодная на сэкс». Актывістка Наста Базар тлумачыць, што можна гаварыць, а чаго ня варта

Пагутарылі зь беларускай фэмактывісткай пра тое, якія словы і выказваньні ня варта выкарыстоўваць у дачыненьні да прадстаўнікоў ЛГБТК-супольнасьці, што такое варожая камунікацыя і як мае выглядаць ідэальнае грамадзтва.
https://www.svaboda.org/a/32342205.html




## Ва Украіне прапанавалі легалізаваць аднаполыя шлюбы паміж вайскоўцамі

«У Вярхоўную раду Украіны накіравалі законапраект аб рэгістрацыі аднаполых шлюбаў. Пра гэта паведаміла дэпутатка ад фракцыі «Голас» Іна Саўсун. Маецца на ўвазе, што дакумент надасць юрыдычную абарону ЛГБТ-вайскоўцам, якія выступаюць на баку Ўзброеных сілаў Украіны (УСУ)».
https://www.tvr.by/news/telegram_novosti/na_ukraine_predlozhili_legalizovat_odnopolye_braki_mezhdu_voennymi/



## ЛГБТ-жаўнеры УСУ давялі, што «любяць Украіну

«Выданне Politico паведамляе, што традыцыйныя каштоўнасці, якія прасоўвае расійскі прэзідэнт, сталіся стымулам для ўкраінскіх геяў запісвацца ў УСУ і рабіцца патрыётамі. З-за гэтага іншыя ўкраінцы сталі больш пазітыўна глядзець на геяў і трансгендараў.
"LGBTQ-жаўнеры на лініі фронту ва Украіне абвергді ідэю пра тое, што гей не можа быць патрыётам», - піша выданне».
https://www.tvr.by/news/telegram_novosti/lgbtk_soldaty_vsu_dokazali_chto_lyubyat_ukrainu/

GP
gpress.info



## Як дэмакратычныя беларусы думалі, што талерантныя, але забыліся перамагчы гамафобію

«Андрэй Завалей, ЛГБТК-актывіст, пачытаў, як у твітэры беларусаў бамбіла ад ЛГБТ-сцяга побач з бчб на антываеннай акцыі ў Швецыі. Выдыхнуў. І напісаў калонку пра тое, чаму наша грамадства дагэтуль прайграе ў барацьбе з гамафобіяй: «Нам з дзяцінства распавядалі, што беларусы – вельмі талерантныя, але давайце прызнаем: вельмі лёгка паважаць «іншых» людзей абстрактна, без рэальнага судатыкнення з імі».
https://kyky.org/pain/kak-demokratichnye-belarusy-dumali-chto-tolerantnye-no-zabyli-pobedit-gomofobiyu



## «Балет на мінным полі». Як улады Беларусі разбурылі грамадзянскую суполнасць і хто цяпер дапамагае ўразлівым групам

«Беларускія жанчыны, якія пацярпелі ад хатняга гвалту, дагэтуль тэлефануюць былым супрацоўніцам прытулку «Радыслава», спадзеючыся на дапамогу, - але арганізацыя ліквідаваная. Сотні маленькіх дзяцей з прытулкаў і дзетдамоў ўжо не атрымоўваюць клопат сацыяльных няняў, калі трапляюць у шпіталь, - дзяржава зачыніла краўдфандынгавую медыяплатформу «Імёны», якая фінансавала праект.
Офіс па правах людзей з інваліднасцю раней кансультаваў да 1400 асобаў штогод. Зараз ён сам «па-за законам».
https://news.zerkalo.io/life/37697.html?c



## Дэпутаты прапанавалі дадаць закон аб СМІ забаронай на прапаганду ЛГБТ

«Адказваючы на ініцыятыву дэпутата пра тое, што трэба ўнесці норму пра забарону прапаганды ЛГБТ у СМІ, міністр адказаў, што ў Беларусі ўжо цяпер прадпрымаюцца захады дзеля абмежавання распаўсюду інфармацыйнай прадукцыі, якая ўтрымлівае прапаганду.
Паводле яго словаў, у Беларусі, «нават не маючы палоснага заканадаўчага акту, прадпрынялі дастатковыя захады, каб распаўсюд прадукцыі, якая прапагандуе ЛГБТ, быў абмежаваны».
https://news.zerkalo.io/life/37152.html?c

## «Людзі часта здымаюць сябе на відэа». Як у Беларусі палітзняволеным бонусам «шыюць» дадатковую крыміналку па парнаграфічных артыкулах

«…Адвакат таксама пацвярджае, што наяўнасць такіх артыкулаў фарміруе спецыфічныя адносіны да зняволенага ў турме. Рызыка дрэнных адносінаў да ЛГБТ-зняволеных у турме ўзрастае».
https://reform.by/ljudi-chasto-snimajut-sebja-na-video-kak-v-belarusi-politzakljuchennym-bonusom-shjut-dopolnitelnuju-ugolovku-po-pornograficheskim-statjam

GP
gpress.info



### Пэўна вы бачылі гэты кулон у форме Беларусі са слязінкай. Пагутарылі з заснавальніцай брэнду Belaruskicry

«У найбліжэйшых планах у брэнду выпусціць вырабы ў падтрымку ЛГБТ-супольнасці, упрыгожванні з беларускім арнаментам, а таксама ў тэхніцы грузінскай старажытнай эмалі».
https://news.zerkalo.io/life/35857.html?c




### «Гэта ніякая не купля зброі». Журналісты спыталі ў Свята-Елісавецінскага манастыра, чаму тыя дапамагаюць расійскім жаўнерам

«…— Там супраць нас за мяжой выступаюць людзі, якія гома-ўсялякія там ЛГБТ-супольнасці і гэтак далей. Яны нас цярпець не могуць, таму што мы за традыцыйныя каштоўнасці. Вось гэтыя людзі – яны і пішуць усялякую гідоту і паклёпы пра манастыр, - кажа манахіня пра актывістаў, якія выступаюць супраць гандлю манастыра ў еўрапейскіх гарадах».
https://news.zerkalo.io/life/35431.html?c



### «Чысты інтэрнэт» і «Мегазадача Беларусія». Усе пішуць пра найбуйнейшую ўцечку з «Роскамнагляду» - сабралі галоўнае

«На сістэму «Окулус» Роскамнагляд мае вялікія планы. Яна прызначана дзеля пошуку забароненых фота і відэа ў інтэрнэце і, як планавалася, павінна будзе аналізаваць 200 тысячаў малюнкаў у суткі па тэмам «экстрэмізм», «заклікі да беспарадкаў», «прапаганда ЛГБТ», «суіцыд», «наркотыкі» і гэтак далей. Напрыклад, «заклікі за беспарадкаў» будуць шукаць па фота Навальнага,«палаючага Крамлю», «штурму Зімовага палацу» і бела-сіне-белага сцягу».
https://news.zerkalo.io/economics/32283.html?c



## Чаму праваслаўная царква ў Беларусі дагэтуль не выступіла супраць вайны? Вялікае інтэрв'ю з тэолагам Наталляй Васілевіч

«Як ні дзіўна, гэтую вайну патрыярх Кірыл разглядае як вызваленне народаў Святой Русі ад прыгнёту калектыўнага Захаду. Таму што апошні, маўляў, хоча паўсюль насадзіць сваю ідэалогію, дэмакратыю, правы чалавека, ЛГБТ-правы. І суверэнная святая Русь супраціўляецца гэтым намаганням. Патрыярх жа нідзе не кажа, што вайна ідзе супраць Украіны. Для яго гэта барацьба супраць калектыўнага Захаду».
https://news.zerkalo.io/life/30595.html?c

## Лукашэнка параўнаў працу геяў і натуралаў ва ўладзе

«Беларускі лідар лічыць, што ў “лесбіянстве” жанчынаў вінныя мужчыны, а геяў прэзідэнт назваў “мярзотай апошняй”. Глядзіце на відэа адказ прэзідэнта на пытанне лідара ЛДПБ Алега Гайдукевіча пасля паслання народу і парламенту.
Ён адзначыў, што прадстаўнікі ЛГБТ-супольнасці ёсць і ў Беларусі, «у нас гэтых людзей дастаткова», у тым ліку, ва ўладзе і не вельмі высокім узроўні. Паводле словаў Лукашэнкі, ён неяк пацікавіўся, як працуюць на сваіх пасадах такія людзі «ва ўрадзе, яшчэ дзесьці, можа, і ў адміністрацыі там ёсць», і атрымаў нечаканы адказ.
«Я даручыў, дакладзіце мне, дайце характарыстыку, што гэта за людзі, як яны працуюць... Дай бог, не-геям так працаваць, як яны. Ніводнай адмоўнай характарыстыкі не было. Ніводнай, правяраў па розных кірунках», - распавёў Лукашэнка.
Беларускі лідар нагадаў пра савецкія часы і крылаты выраз пра тое, што «у СССР сексу не было», і паразважаў аб тым, што было б, каб зараз з'явілася забарона на нетрадыцыйныя адносіны.
«Ну давайце мы гэтым мужыкам будзем забараняць кувыркацца з іншымі мужыкамі, ну да чаго гэта прывядзе? Ні да чога. Тым болей праблемаў нам не ствараюць, працуюць добра», — адзначыў Лукашэнка».
https://sputnik.by/20230331/lukashenko-sravnil-rabotu-geev-i-naturalov-vo-vlasti--video-1073889530.html



## Субкультура анімэ прапагандуе ЛГБТ? Гісторыя слуцкай мамы і парады псіхолагаў

«Я не прыхільніца ЛГБТ, у нас традыцыйная сям'я. Дзецям даем нармальнае развіццё, уключаючы гурткі, секцыі. І прыкладаў дрэнных у нашай сям'і няма. Мы не насаджаем свае прынцыпы, але сямейныя каштоўнасці і традыцыі ў нас заўсёды былі на першым месцы, - гаворыць жанчына.
Святлана распавядае, што ў той жа вечар стала цікавіцца ў знаёмых, ці сутыкаўся хтосьці з такой праблемай – і высветліла, што такія выпадкі ёсць. Адзін з іх прывёў да аднаполага кахання паміж дзяўчынкамі старэйшых класаў».
http://slutsk-gorod.by/novosti/item/anime

## Псеўдадэмакратыя, ці Невясёлкавае ўспрынящце рэчаіснасці

Нашыя продкі змагаліся і аддавалі свае жыцці за раўнапраўе ў свеце, незалежнасць сваёй Радзімы, яе будучыню, працяг усталяваных традыцыяў. Ці ўяўлялі яны, што амаль праз стагоддзе ў інфармацыйнай вайне, якая ахапіла ўвесь свет, у тым ліку Беларусь, адным з краевугольных камянёў стане ЛГБТ-рух?
Навязванне яго ідэяў з'яўляецца моцнай зброяй у ідэалагічнай барацьбе за сусветнае панаванне.
Пра гэта адбылася размова з ваенным камісарам вобласці Русланам Шкодзіным.
https://vitvesti.by/obshestvo/psevdodemokratiia-ili-neraduzhnoe-vospriiatie-deistvitelnosti.html

GP
gpress.info



## Янскі: ЛГБТ-прапаганда на Захадзе ўжо з'яўляецца часткай адукацыйнага працэсу

«ЛГБТ-прапаганда на Захадзе ўжо з'яўляецца часткай адукацыйнага працэсу, заявіў член апякунскай рады Міжнароднага дабрачыннага фонду імя Эміля Чэчкі Павел Янскі на прэсавай канферэнцыі "Падтрымка і прасоўванне праваабарончых ініцыятываў у Еўрапейскім звязе", паведамляе карэспандэнт БЕЛТА».
https://www.belta.by/society/view/janski-lgbt-propaganda-na-zapade-uzhe-javljaetsja-chastjju-obrazovatelnogo-protsessa-555958-2023/



## Як ЛГБТ-рух выйшаў з ценю і захапіў заходні свет

«У беларускім соцыюме праблемы ЛГБТ-кам'юніці не існуе як такой. Прычынаў таму некалькі. Па-першае, наша грамадства прытрымліваецца традыцыйных каштоўнасцяў, якія склаліся на працягу стагоддзяў, падвалінамі якіх з'яўляецца акурат уяўленне пра адносіны мужчын і жанчын, сям'ю і дзяцей. Па-другое, у светапоглядзе беларусаў нашмат больш важнае месца займаюць пытанні, ад якіх залежыць дабрабыт грамадзянаў: стабільнасць, незалежнасць, харчовая бяспека».
https://www.sb.by/articles/diktatura-radugi.html



## ЛГБТ як вяршыня айсберга. Антытрэнды, якія навязваюцца грамадству

«…А надоечы ў Мінску адбыўся круглы стол, які зладзіла ГА «Гільдыя бацькаў», і прысвечаны ён быў тэме выклікаў і пагроз маральным і сямейным каштоўнасцям у сучасным грамадстве. Паводле яго вынікаў плануецца накіраваць стэнаграму з ініцыятывай аб забароне прапаганды ЛГБТ ва ўсіх яе праявах у Беларусі, як гэта зрабілі ў Расійскай Федэрацыі».
https://mlyn.by/04022023/lgbt-kak-verhushka-ajsberga-antitrendy-kotorye-navyazyvayutsya-obshhestvu/



## Транс-гістэрыя ў заходніх школах

«14-гадовая брытанская школьніца, якая пажадала застацца ананімнай, распавядае пра дзяўчынак, якія перацягваюць персі, заняткі пра небінарную Лэдзі Макбет, і пра звычайных дзяцей-«трансфобаў», якім пагражаюць засільваннем.
У яе ёсць падставы баяцца казаць праўду, але такое жыццё сталася невыносным, і дзяўчынка вырашыла «раскрыць выданню «Дэйлі мэйл» праўду пра жыццё ў культурнай вайне, якая працягваецца».
https://mediabrest.by/news/novosti-v-mire/trans-isteriya-v-zapadnyh-shkolah

GP
gpress.info



## Асацыяльны персанаж бярэцца за вырашэнне «сацыяльных пытаннечкаў»

«У падстаўным кабінеце збеглых прыбаўленне. Да літоўскага бардэлю з размаітых аферыстаў, экстрэмістаў, наркаманаў, алкаголікаў і геяў прыбілася лесбійка – Вольга Гарбунова. Будзе апекавацца «сацыяльнымі пытаннечкамі» (так яна кажа ў інтэрв'ю). Сацыяльныя! Асацыяльны, пазбаўлены маральнасці персанаж стане вучыць кагосьці жыццю. Аёй, чым ніжэй прынцыпы, тым вышэй еўраганарары».
https://www.sb.by/articles/nizhe-printsipy-vyshe-evrogonorary.html




## У што Захад ператварыў 8 Сакавіка, і як нам не дапусціць падобнага

«Пагадзіцеся, няма адчування асаблівай увагі менавіта да пытанняў і правоў жанчынаў. А ў святле шырыні і глыбіні праблемаў чарговага гендарна-дэфектыўнага руху наогул незразумела, ці ёсць каму справа да праблемаў жанчын у Амерыцы і Еўропе. Тут бы ўсіх гэты транс, квір, флюід, неда-, пера- і іншых гендараў паспець уладзіць.
Прагапіўшы момант, калі ЛГБТ-меншасць апярылася і пачала дыктаваць умовы свету, феміністкі цяпер сутаргава спрабуюць вырвацца са становішча, калі правы жанчынаў пачалі ўспрымаць яе нешта неістотнае. І што найбольш жахліва, феміністкі, як і ўвесь «прагрэсіўны заходні свет», не наважваюца пярэчыць гендарна-нездаровай меншасці».
https://www.sb.by/articles/8-marta-za-chto-borolis.html




## «Аддадзена каманда на зачысткі». Карпянкоў распавёў, як будуць вылічваць суполкі збеглых у Беларусі

«…А памятаеце становішча, калі гэты вялікі вогненны рабак хадзіў у нас па Мінску, і гэтыя смаркатыя наркаманы-гомасексуалісты кіравалі ім з-за мяжы. І яне ўсе не ведалі, куды ім прымкнуць, і там такая была галава, якая іх вадзіла то туды, то сюды, асабліва агрэсіўная. Мы як раз з дапамогай выкарыстання лятальных апаратаў усіх ідэнтыфікуем, вызначым і, калі трэба будзе, затрымаем з пэўным сюрпрызам».
https://ctv.by/otdana-komanda-na-zachistki-karpenkov-rasskazal-kak-budut-vychislyat-yacheyki-beglyh-v-belarusi



## Арганізацыя прафілактыкі ібарацьбы з ІППШ

«Згодна з даследаваннямі (дазорны эпідэміялагічны нагляд у рамках Дзяржаўнай праграмы па прафілактыцы ВІЧ-інфекцыі)), якія праводзіліся ў Беларусі, паражэнне інфекцыямі, што перадаюцца палавым шляхам, сярод груп рызыкі (прастытуткі, мужчыны-гомасексуалісты) перавышае 20%".
[https://minzdrav.gov.by/dlya-belorusskikh-grazhdan/profilaktika-zabolevaniy/profilaktika-vich-spid-i-ippp/organizatsiya-profilaktiki-i-borby-s-ippp.php](https://minzdrav.gov.by/dlya-belorusskikh-grazhdan/profilaktika-zabolevaniy/profilaktika-vich-spid-i-ippp/organizatsiya-profilaktiki-i-borby-s-ippp.php)



## «Уражвальныя гістарычныя факты». Іерархі БАЦ зрабілі дзіўныя заявы пра Украіну, «ментальную вайну» і павышаную духоўнасць беларусаў

«Архіепіскап Наваградскі і Слонімскі Гурый. На ягоную думку, кіраўніцтва Украіны знаходзіцца «пад пільным кантролем Захаду», які ў сваю чаргу імкнецца «знішчыць праваслаўе як аснову рускай культуры, прапанаваўшы наўзамен ЛГБТ, легалізацыю наркотыкаў, гэтак званую талерантнасць, якая раскладае грамадства, розная кшталту псеўдакультуру і забыццё шматвяковай гісторыі продкаў».
[https://news.zerkalo.io/life/31221.html?c](https://news.zerkalo.io/life/31221.html?c)




## Як гарадзенская кантрабандыстка сталася найбольш вядомай даносчыцай краіны. Распавядаем гісторыю Вольгі Бондаравай

«У жніўні 2022 года Бондаравай не спадабаліся паветраныя змеі ў краме цацак у гандлёва-забаўляльным комплексе Triniti. Белы адзінарогі з вясёлкавымі загрыўкамі былі ўспрынятыя жанчынай як прапаганда «ЛГБТ-сімволікі», скіраваная на дзяцей.
У кастрычніку 2022 года яе абурыў білборд з рэкламай слухавак у цэнтры Мінска. Мадэль на ім Бондарава назвала «трансгендарам», а ў яе знешнасці знайшла «прапаганду ЛГБТ».
[https://news.zerkalo.io/life/30515.html?c](https://news.zerkalo.io/life/30515.html?c)

# Запрашаем на GayPress

**Мы ў сацыяльных сетках:**

YouTube

Instagram

TikTok

Вконтакте

Telegram

Яндекс.Дзен

Facebook

Twitter

E-mail: gaypresseu@gmail.com

GP

gpress.info